# Цуды на стыку рук і агню

Выстаўка керамікі «Між рукамі і полымем», арганізаваная адным з самых маладых беларускіх грамадскіх аб'яднанняў – Гільдыяй керамістаў, працавала ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» з 25 студзеня па 8 лютага.

Сярод 18 аўтараў – аўтарытэтныя ўжо майстры і мастакі-пачаткоўцы, ёсць сябры Беларускага саюза мастакоў і Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, педагогі цэнтраў дадатковай адукацыі, мастацкіх школаў, каледжаў і вышэйшых навучальных установаў. Кожны твор адсылае гледача да вытокаў беларускай традыцыйнай культуры, напоўненых разнастайнымі вобразамі, сімваламі і знакамі. Куратар выстаўкі Соф'я Сівер-Духоўнікава адзначыла: «На стыку рук і агню ствараецца цуд: кавалак гліны ператвараецца ў арт-аб'ект або твор дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, якое жыве ўласным жыццём».



У межах выстаўкі адбыліся творчыя сустрэчы і майстар-класы з вядомымі керамістамі: арганізатарам Міжнароднага пленэру па кераміцы «Арт-Жыжаль» Валерыем Калтыгіным, прафесарам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхаілам Казарогам, сябрам Беларускага саюза мастакоў Аляксандрам Зіменкам.





Пад час адкрыцця выстаўкі павіншавалі Гільдыю керамістаў з дэбютам дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Валерый Жук, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Тамара Васюк, сябра Беларускага саюза мастакоў Ларыса Фінкельштэйн і іншыя.

*Павел САПОЦЬКА,*
*дырэктар мастацкай галерэі «Універсітэт культуры»*
*Фота Кацярыны АЛЯКСЕЕВАЙ*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ